дело в БССР: из истории библиотек республики. Минск, 1969. С. 61–67; **Кравцова, В.** Слуцкая центральная городская библиотека / В. Кравцова // Библиотечное дело в БССР: сборник научных работ. Минск, 1974. С. 37–43.

14. **Белоруссия** в эпоху феодализма: сборник документов и материалов: в 4 т. / Главное архивное управление при Совете Министров БССР, Институт истории АН БССР. Минск: Наука и техника, 1979. Т. 4: Социально-политическая история и культура Белоруссии первой половины XIX в. Отечественная война 1812 г. / составители: В.В. Чепко, В.В. Шатилло. С. 344–350.

15. **Сборник** распоряжений графа Михаила Николаевича Муравьева по усмирению польского мятежа в Северо-Западных губерниях, 1863–1864 / составитель Н. Цылов. Вильна: Типография А. Киркора и бр. Ромм, 1866. С. 25, 279.

16. **Нацыянальны** гістарычны архіў Беларусі. Фонд 458. Воп. 1. Адз. зах. 140. Ч. 1. Л. 16.

17. **Нацыянальны** гістарычны архіў Беларусі. Фонд 1430. Воп. 1. Адз. зах. 2000. Л. 76.

18. **Нацыянальны** гістарычны архіў Беларусі. Фонд 458. Воп. 1. Адз. зах. 140. Л. 287–287ад.

19. **Нацыянальны** гістарычны архіў Беларусі. Фонд 458. Воп. 1. Адз. зах. 207. Л. 7–7ад.

***Зыгмантовіч С.В., Дзямешка Л.А.*** *(Мінск)*

## ДА ГІСТОРЫІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ Ў ГАЛІНЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ Ў БЕЛАРУСІ

У далёкім 1944 г., калі Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ляжала ў руінах, кіраўніцтва краіны было заклапочана не толькі аднаўленнем эканомікі, але і інтэлектуальным, культурным, духоўным развіццём народа. Так з'явілася ідэя аб неабходнасці падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі, а практычнай рэалізацыяй гэтай ідэі стала адкрыццё пры Мінскім педагагічным інстытуце (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка) бібліятэчнага факультэта і адначасова кафедры бібліятэказнаўства (з 2003 г. – кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы). Мена-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

віта кафедра бібліятэказнаўства і з'явілася заснавальніцай вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Прааналізаваўшы доўгі шлях станаўлення і развіцця кафедры, у яе гісторыі можна вылучыць некалькі этапаў:

1. Арганізацыя і першапачатковае станаўленне, звязанае з развіццём бібліятэчнай справы і адукацыі ў краіне (1944–1960 гг.).

2. Паступовае развіццё, вызначанае павелічэннем колькасці штатных выкладчыкаў і вылучэннем з яе складу кафедры бібліяграфіі (1961–1974 гг.).

3. Гэты этапы звязаны з новым статусам кафедры ў сувязі з адкрыццём Мінскага інстытута культуры, перайменаванага затым у Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, фарміраваннем асноўнага складу выкладчыкаў-навукоўцаў, ростам патрабаванняў да бібліятэчнай прафесіі (1975–2003 гг.).

4. Перайменаванне кафедры бібліятэказнаўства ў кафедру менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы у сувязі з рэарганізацыяй бібліятэчнага факультэта ў факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый і адкрыццём у падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў новых спецыялізацый (з 2003 г.).

Кожны з гэтых этапаў адзначаны пэўнымі пошукамі і дасягненнямі і характарызуе паступовы шлях развіцця кафедры, непарыўна звязаны з трансфармацыяй грамадства.

Узначаліў кафедру і кіраваў ёю на працягу амаль дзесяці гадоў (1944–1952 гг.) выдатны бібліятэказнаўца і бібліёграф, дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна (цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ)) Іосіф Бенцыянавіч Сіманоўскі. Менавіта ён унёс неацэнны ўклад у бібліятэчнае будаўніцтва Беларусі, сфарміраваў падмурак кафедры, быў першым яе выкладчыкам [1]. Іосіф Бенцыянавіч не толькі меў вялікі аўтарытэт у бібліятэчным свеце, але і валодаў цудоўнымі арганізатарскімі здольнасцямі. Ён сфарміраваў першы штат кафедры: запрасіў выкладчыкаў з бібліятэчных інстытутаў Масквы і Ленінграда (дацэнтаў Л.А. Левіна, А.А. Громаву, старшага выкладчыка М.А. Дзічкоўскую), вопытных практыкаў – супрацоўнікаў Дзяржаўнай бібліятэкі БССР (Н.Б. Ватацы, Н.В. Каляду, М.І. Масенжнік, А.П. Дземчанкаву) [2].

Калектыў штатных выкладчыкаў складаўся паступова, і ўжо ў 1949–1950 гг. на кафедры працавалі 3 штатныя выкладчыкі і 4 сумяшчальнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Становучую ролю ў першапачатковым станаўленні кафедры выканалі вопытныя старшыя выкладчыкі, якія затым шмат гадоў працавалі ў бібліятэчнай адукацыі: К.С. Верабей (1948–1968 гг.), К.Г. Маўрычава (1949–1969 гг.), Н.М. Калоска (1960–1981 гг.), В.П. Буракова-Іванова (1954–1979 гг.). Гэта яны распрацоўвалі і чыталі першыя спецыяльныя дысцыпліны «Бібліятэчныя каталогі» (К.С. Верабей), «Работа з чытачамі» (К.Г. Маўрычава), «Гісторыя бібліятэчнай справы» (Н.М. Калоска).

Другім загадчыкам кафедры (з 1952 г.) стаў бібліёграф дацэнт М.Ц. Талкачоў, які ўзначальваў яе да 1961 г. Адзнакай гэтага часу стала навуковая дзейнасць кафедры. К.С. Маўрычава даследавала тэорыю і методыку чытацкіх інтарэсаў, В.П. Іванова – чытацкія інтарэсы моладзі, К.С. Верабей – класіфікацыю і сістэматызацыю дакументаў, М.Ц. Талкачоў – тэарэтычныя асновы бібліяграфічных дысцыплін.

Першыя публікацыі выкладчыкаў знайшлі адлюстраванне на старонках часопіса «Бібліятэкар» (1957, 1959, 1961 гг.), у «Вучоных запісках» Мінскага педагагічнага інстытута (1957 г.), у матэрыялах розных навуковых і навукова-практычных канферэнцый.

Між тым, развіццё бібліятэчнай справы ў Беларусі патрабавала далейшага павышэння ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў. Кіраўніцтвам інстытута было вырашана стварыць на базе кафедры бібліятэказнаўства дзве спецыяльныя кафедры, а менавіта – вылучыць з яе кафедру бібліяграфіі (загадчыкам новай кафедры стаў М.Ц. Талкачоў).

З гэтай падзеі пачаўся новы этап развіцця бібліятэчнага факультэта і кафедры бібліятэказнаўства [3], які характарызаваўся папаўненнем яе кадрамі з вучонымі ступенямі і далейшым развіццём навукова-даследчай дзейнасці. З'явілася магчымасць падрыхтоўкі высокакваліфікаваных выкладчыкаў праз мэтавую аспірантуру інстытутаў культуры Масквы і Ленінграда.

Першым выкладчыкам, які скончыў мэтавую аспірантуру Маскоўскага інстытута культуры і абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства» (1967 г.), стала М.І. Пакала. Яе шматгадовая педагагічная дзейнасць на кафедры (1958–1992 гг.) і актыўныя даследчыя намаганні далі добры вынік: былі распрацаваны першыя вучэбныя праграмы па дысцыплінах «Бібліятэчныя фонды» і «Гісторыя бібліятэчнай справы ў БССР» і выдадзены аднайменныя падручнікі для студэнтаў [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Імпульсам да навукова-даследчай дзейнасці кафедры з'явілася магчымасць публікацыі матэрыялаў у прафесійным навуковым зборніку «Пытанні бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства» (заснаваны ў 1972 г. па ініцыятыве М.Ц. Талкачова).

Найбольшую актыўнасць у галіне НДР праяўлялі выкладчыкі, якія прыйшлі на кафедру з вялікім практычным вопытам, – В.А. Дукель, І.П. Емец, Т.Ц. Латоціна-Князева, А.Ф. Галуза, Р.А. Ролева, Р.А. Кучур.

Вывучаліся амаль усе аспекты бібліятэчнай справы, але асаблівая ўвага надавалася гісторыі. Н.М. Калоска даследавала гістарычны перыяд 1917–1937 гг. і абараніла кандыдацкую дысертацыю [5]. Амаль гэты ж перыяд вывучала І.П. Емец і абараніла кандыдацкую дысертацыю «Роля бібліятэк БССР у сацыялістычным будаўніцтве, 1926–1937 гг.» [6]. Т.Ц. Латоціна-Князева даследавала дзейнасць бібліятэк у 1959–1966 гг. і абараніла кандыдацкую дысертацыю па гісторыі бібліятэчнай справы [7].

А.Ф. Галуза, І.П. Емец, Н.М. Калоска прымалі актыўны ўдзел у выданні першага манументальнага даведніка «Бібліятэчная справа ў БССР: дакументы і матэрыялы, 1918–1941 гг.», выпушчанага выдавецтвам «Вышэйшая школа» ў 1978 г. У другім даведніку «Бібліятэчная справа ў БССР: дакументы і матэрыялы, 1941–1958 гг.», апублікаваным у 1984 г., непасрэдны ўдзел прымала М.І. Пакала. Адначасова рабіліся першыя крокі па даследаванні педагагічных асноў бібліятэчнага абслугоўвання чытачоў. В.А. Дукель абараніла кандыдацкую дысертацыю «Педагагічныя асновы ўплыву адкрытага доступу да фондаў бібліятэк на фарміраванне чытацкіх інтарэсаў» [8].

Узначальваў кафедру ў гэты перыяд кандыдат гістарычных навук, дацэнт В.Ф. Якіменка, які быў залічаны ў штат кафедры па выніках усесаюзнага конкурсу сярод кандыдатаў навук і дацэнтаў у 1973 г.

Такім чынам, напрыканцы другога этапу развіцця кафедры значна ўзрос яе навуковы патэнцыял, з'явіліся метадычныя распрацоўкі, тэарэтычны матэрыял краязнаўчага характару, што спрыяла павышэнню якасці выкладання спецыяльных дысцыплін.

У гэты ж перыяд змястоўна мяняецца падрыхтоўка спецыялістаў: з універсальнай, разлічанай у асноўным на патрэбы публічных бібліятэк, яна становіцца спецыялізаванай. За кафедрай зама-

цоўваецца падрыхтоўка бібліятэкараў па спецыялізацыях «масавыя і навуковыя бібліятэкі» і «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі».

Трэці этап развіцця кафедры звязаны з адкрыццём у 1975 г. Мінскага інстытута культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў). Кафедра набывае новы статус. Яна становіцца на факультэце вядучай і цесна супрацоўнічае з новымі кафедрамі – тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі, дзіцячай літаратуры і бібліятэчнай работы з дзецьмі. На кафедру прыходзяць маладыя выкладчыкі У.А. Акуліч, Л.А. Дзямешка, Н.У. Клімянкова, Н.А. Ляйко, С.А. Паўлава, Р.С. Матульскі, Н.В. Алянюк. Усе яны паспяхова абараняюць дысертацыі ў аспірантурах Маскоўскага і Ленінградскага інстытутаў культуры, Мінскага педагагічнага інстытута. Працэнт выкладчыкаў з навуковымі ступенямі і званнямі дасягнуў 60. Гэта дала магчымасць больш глыбока распрацоўваць праблемы бібліятэказнаўства, стымуляваць навукова-даследчую работу студэнтаў. Яскрава акрэсліліся прадметна-метадычныя камісіі.

Гісторыю бібліятэчнай справы даследуюць кандыдаты гістарычных навук У.А. Акуліч, І.П. Емец, В.Ф. Якіменка. Пытанні чытачазнаўства знаходзяць адлюстраванне ў даследаваннях кандыдатаў філалагічных навук Л.І. Пятровічавай, С.А. Паўлавай. Праблемы арганізацыі бібліятэчнай справы вывучаюцца выкладчыкамі І.М. Стрыжонак, Т.І. Чаплыгінай, Г.П. Сёмінай; праблемы каталагізацыі – кандыдатам педагагічных навук Л.І. Казлоўскай, кандыдатам гістарычных навук Н.А. Ляйко, выкладчыкам А.І. Фядорынай; праблемы абслугоўвання чытачоў бібліятэк – кандыдатамі педагагічных навук Н.У. Клімянковай, Л.А. Дзямешка, В.А. Дукель.

Пашыраецца дыяпазон навуковых прац, выдаюцца манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі.

Распрацоўваюцца метадычныя матэрыялы і здзяйсняюцца комплексныя даследаванні кафедры, вынікі якіх падводзяцца па пяцігодках: «Развіццё бібліятэчнай справы ў Беларусі» (1981–1985 гг.); «Бібліятэчнае абслугоўванне насельніцтва БССР» (1986–1990 гг.); «Кніга і чытанне ў сістэме міжнацыянальных стасункаў» (1991–1995 гг.); «Бібліятэчная справа ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць» (1996–2000 гг.); «Фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь і іх кадравага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патэнцыялу: гісторыя, сучаснасць» (2001–2005 гг.). Навуковым кіраўніком комплексных тэм прызначана дацэнт Л.А. Дзямешка.

На працягу 1970–90-х гг. выходзяць з друку манаграфіі: «Савецкі рабочы-чытач» (Л.І. Пятровічава, 1978 г.), «Савецкі селянін-чытач» (Л.І. Пятровічава, 1981 г.), «Інтэрнацыянальнае выхаванне моладзі» (Л.А. Дзямешка, 1984 г.), «Роля бібліятэкі ПТУ у прафесійным і духоўным станаўленні маладых рабочых» (Н.У. Клімянкова, 1990 г.); дэпаніраваны манаграфічны зборнік «Бібліятэчная справа ў Беларускай ССР» (У.А. Акуліч, Л.А. Дзямешка, 1987 г.), кафедральная манаграфія «Бібліятэчная справа ў Рэспубліцы Беларусь: здабыткі і перспектывы» (2001 г.). У 1999 г. выйшла калектыўная манаграфія «Дзейнасць устаноў культуры па мінімізацыі наступстваў Чарнобыльскай трагедыі» (у сааўтарах – У.А. Акуліч, С.А. Паўлава).

Можна сцвярджаць, што гэта быў сапраўдны росквіт навукова-даследчай работы кафедры.

Кафедра са дня свайго заснавання працуе над удасканаленнем вучэбнай дзейнасці. Кожныя пяць гадоў удакладняюцца вучэбныя планы. Гэта цяжкі і прадуктыўны пошук. Некаторыя курсы цалкам змяніліся ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Напрыканцы трэцяга этапу развіцця кафедра забяспечвала выкладанне курсаў: «Бібліятэказнаўства: тэорыя», «Бібліятэказнаўства: гісторыя», «Каталагізацыя дакументаў», «Бібліятэчныя фонды», «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», «Абслугоўванне чытачоў», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг», «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент» і інш.

Кафедра курыравала падрыхтоўку студэнтаў па спецыялізацыях: «публічныя бібліятэкі», «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі», «бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура», «менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы». Асаблівая ўвага надавалася падрыхтоўцы бібліятэкараў для публічных, дзіцячых і школьных бібліятэк, патрабаванні да якіх значна ўзраслі. Гэтым патрабаванням павінны былі адпавядаць уведзеныя новыя дысцыпліны: «Фарміраванне фондаў і арганізацыя каталогаў у публічных бібліятэках», «Фарміраванне інфармацыйнай культуры асобы», «АБІС публічных бібліятэк», «Чытачазнаўства», «Бібліятэка і вольны час», «Бібліятэчныя зносіны», «Бібліятэрапія», «Паблік рылэйшнз у бібліятэцы», «Публічная бібліятэка – асяро-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дак нацыянальнай культуры», «Інфармацыйна-бібліяграфічная дзейнасць публічнай бібліятэкі» і інш.

Для спецыялізацыі «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі» выкладаліся дысцыпліны: «Дзіцячае чытачазнаўства і асаблівасці абслугоўвання дзяцей», «Псіхалогія дзіцячага чытання», «Сусветная літаратура для дзяцей і юнацтва», «Беларуская літаратура для дзяцей», «Навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей», «Арганізацыя і кіраванне работай школьнай бібліятэкі», «Фарміраванне фондаў і арганізацыя каталогаў у дзіцячых і школьных бібліятэках», «Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва», «Фарміраванне інфармацыйнай культуры асобы», «Мультымедыя ў дзіцячых бібліятэках» і інш.

Калі падрыхтоўка кадраў па спецыялізацыях «публічныя бібліятэкі» і «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі» з'яўлялася традыцыйнай для кафедры, то падрыхтоўку студэнтаў па спецыялізацыі «маркетынг бібліятэчнай справы» кафедра стала ажыццяўляць з 1994 г.

Студэнты гэтай спецыялізацыі рыхтуюцца да выканання функцый менеджэра ў органах кіравання бібліятэчнай справай, да працы на кіруючых пасадах у бібліятэках розных тыпаў, да кіравання рознымі службамі і структурнымі падраздзяленнямі бібліятэчных устаноў і іншых арганізацый сістэмы дакументных камунікацый, да працы ў аддзелах маркетынгу і рэкламы.

Спецыялізацыя «бібліятэказнаўства, бібліяграфія і беларуская мова і літаратура» з прысваеннем дадатковай кваліфікацыі «выкладчык беларускай мовы і літаратуры» была вынаходніцтвам і здабыткам дацэнта кафедры Н.А. Ляйко. Падрыхтоўка па ёй паспяхова вядзецца з 1994 г. Спецыялісты працуюць у публічных і школьных бібліятэках, часам спалучаюць працу ў бібліятэцы з работай у якасці настаўніка ў школе.

На трэцім этапе развіцця кафедры шмат увагі ўдзялялася падрыхтоўцы вучэбна-метадычных матэрыялаў: выдадзены вучэбныя дапаможнікі «Бібліятэчнае абслугоўванне» (Л.А. Дзямешка, Н.У. Клімянкова, С.А. Паўлава), «Бібліятэказнаўства: тэорыя бібліятэчнай справы» (Р.С. Матульскі), «Бібліятэчныя каталогі» (Н.А. Ляйко, Л.І. Казлоўская, Р.А. Ролева), «Бібліятэка і вольны час» (Л.А. Дзямешка), «Табліцы для дзіцячых і школьных бібліятэк: бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя» (Н.А. Ляйко, А.І. Фядорына), хрэстаматыя «Заканадаўчыя, рэгламентуючыя і статыстычныя матэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыялы па бібліятэчнай справе» (Р.С. Матульскі), даведнік «Бібліятэчная справа ў Рэспубліцы Беларусь» (Р.С. Матульскі).

Кафедра заключыла дагаворы і наладзіла цеснае супрацоўніцтва з замежжам: з Сафійскім і Вяліка-Тырнаўскім універсітэтамі (Балгарыя), Варшаўскім і Ягелонскім універсітэтамі (Польшча), Вышэйшай школай бібліятэчнай і інфармацыйнай справы ў Штутгарце (Германія), Дагестанскім універсітэтам, ВНУ Нідэрландаў. Вынікам супрацоўніцтва з'яўляецца выязная практыка студэнтаў у гэтых краінах; стажыроўкі выкладчыкаў у бібліятэках і ВНУ замежжа; сумесныя міжнародныя канферэнцыі па праблемах агульных даследаванняў («Польская кніга і чытач на Беларусі», «Беларуская кніга і чытач у Польшчы»); правядзенне лекцый ва універсітэтах замежных краін; шматлікія публікацыі ў замежным друку.

Трэці этап развіцця кафедры, як бачым, характарызуецца пашырэннем сферы навукова-даследчых, вучэбна-метадычных інтарэсаў і пэўнымі дасягненнямі. Вось некаторыя напрацоўкі:

– створана сістэма і алгарытм вывучэння курсаў «Сусветная гісторыя бібліятэчнай справы», «Бібліятэчны фандрэйзінг» (дацэнт У.А. Акуліч);

– распрацавана тэрміналогія ў галіне бібліятэчнай справы, якая адлюстравана ў тэрміналагічных, перакладных і тлумачальных слоўніках (прафесар Л.А. Дзямешка);

– удакладнена заканадаўчая база бібліятэчнай справы (дацэнт Р.С. Матульскі);

– пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры абаронены 4 кандыдацкія дысертацыі (навуковыя кіраўнікі – Л.А. Дзямешка, Н.У. Клімянкова, Н.А. Ляйко);

– распрацавана методыка выкарыстання ў вучэбным працэсе прэзентацыйных матэрыялаў, падрыхтаваных з дапамогай праграмы Microsoft PowerPoint (дацэнт С.А. Паўлава);

– абаронена першая доктарская дысертацыя «Бібліятэка як сацыяльны інстытут: тэарэтыка-метадалагічны аспект» (дацэнт Р.С. Матульскі);

– падрыхтавана аснова для адкрыцця пры універсітэце факультэта перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў (яго першы дэкан – дацэнт Н.В. Алянюк).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чацвёрты этап развіцця кафедры пачаўся ў 2003 г. у сувязі з рэарганізацыяй факультэта. Кафедра бібліятэказнаўства была перайменавана ў кафедру менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы. Ёю загадвае кандыдат педагагічных навук, дацэнт С.В. Зыгмантовіч; працуюць 9 выкладчыкаў, у тым ліку 1 прафесар, 7 дацэнтаў, 1 старшы выкладчык і 1 выкладчык. Пасля заканчэння аспірантуры БДУ культуры і мастацтваў на кафедру прыйшлі маладыя выкладчыкі Н.Я. Петушка, Ю.М. Галкоўская (Макушынская), Ю.А. Пераверзева. Як сумяшчальнікі на кафедры працуюць дырэктар НББ, доктар педагагічных навук, прафесар Р.С. Матульскі, вучоны сакратар НББ А.А. Капырына, вучоны сакратар БелДІПК, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Л.І. Ракавецкая і інш. Кафедра мае высокі навуковы цэнз: 66% выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі.

Набыццё кафедрай такой назвы і статуса з'явілася адэкватнай рэакцыяй на новую сацыяльна-культурную парадыгму развіцця бібліятэчнай справы, на бягучыя патрэбнасці айчыннай бібліятэчнай практыкі, звязаныя з неабходнасцю грунтоўнай падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы менеджменту бібліятэчнай справы. Сёння для работы ў бібліятэках ад іх патрабуецца больш шырокае бачанне галіновых праблем, удзел у развіцці грамадскіх сувязей бібліятэк, праектнай, прадпрымальніцкай дзейнасці, прыцягненні пазабюджэтных сродкаў; валоданне тэхнічнымі, сацыяльна-эканамічнымі, сацыяльна-псіхалагічнымі і педагагічнымі ведамі, навыкамі і ўменнямі працаваць у калектыве. Увядзенне ў агульнарэспубліканскі класіфікатар спецыяльнасцяў і спецыялізацый падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй накірунку «менеджмент» па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» і адпаведна прысваенне частцы выпускнікоў факультэта кваліфікацыі «бібліятэкар-бібліёграф, менеджэр» зрабіла аб'ектыўна неабходнымі не толькі арганізацыйныя змены, але і перагляд канцэптуальных падыходаў да зместу выкладання.

Выкладчыкамі распрацавана сістэмная канцэпцыя базавай упраўленчай падрыхтоўкі студэнтаў адпаведнай кваліфікацыі з уключэннем цыкла інавацыйных курсаў; прадугледжаны спецыяльныя курсы (дысцыпліны спецыялізацыі). Фундаментальная частка профільнай упраўленчай падрыхтоўкі рэалізуецца праз выкладанне такіх дысцыплін, як «Бібліятэчна-інфармацыйны ме-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неджмент», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг», «Інфармацыйны рынак». Студэнты таксама атрымліваюць веды па «Тэхналагічнаму бібліятэчнаму менеджменту», «Інавацыйнаму бібліятэчнаму менеджменту», «Фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк», «Прававаму забеспячэнню дзейнасці бібліятэк», «Бібліятэчнай статыстыцы», «Бібліятэчнаму фандрэйзінгу», «Паблік-рылэйшнз і бібліятэчнай рэкламе», «Псіхалогіі кіравання», «Кіраванню персаналам бібліятэкі» і інш.

Акрамя таго, кафедра з'яўляецца выпускаючай для шэрага спецыялізацый: «маркетынг бібліятэчнай справы», «бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва», «культурна-дасугавая дзейнасць бібліятэк», «кнігазнаўства і менеджмент кніжнага гандлю». Студэнтам выкладаюцца дысцыпліны спецыялізацый, якія маюць апрабаваную вучэбна-метадычную дакументацыю і адаптаваныя дыдактычныя распрацоўкі.

Выкладчыкі кафедры шмат увагі надаюць вучэбна-метадычнаму забеспячэнню навучальнага працэсу, распрацоўцы і ўкараненню ў вучэбны працэс новых педагагічных і інфармацыйных тэхналогій. Выдадзены шэраг вучэбных дапаможнікаў, якім прысвоены грыф Міністэрства адукацыі: «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці» (дацэнт С.В. Зыгмантовіч), «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» (прафесар Л.А. Дзямешка, дацэнт С.А. Паўлава,), «Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі» (дацэнт С.В. Зыгмантовіч); падрыхтаваны да выдання вучэбны дапаможнік «Тэхналагічны бібліятэчны менеджмент» (дацэнт Л.І. Ракавецкая). Вялікая работа праведзена па падрыхтоўцы тыпавых вучэбных праграм, тэкстаў лекцый, вучэбна-метадычных комплексаў для электроннай бібліятэкі універсітэта. Сярод інавацыйных педагагічных тэхналогій – праектная і праблемна-сітуацыйная методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін і арганізацыі самастойнай работы студэнтаў; насычэнне вучэбнага працэсу практыка-арыентаванымі тэхналогіямі і заданнямі; выкарыстанне такіх актыўных форм, як ролевыя і дзелавыя гульні, трэнінгі, вырашэнне вытворчых сітуацый; дыялогава-дыскусійныя метады; падрыхтоўка мэтанакіраваных мерапрыемстваў; метад «кейсаў», індывідуальныя заданні; рэйтынгавы кантроль вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, выкарыстанне тэстаў, прэзентацыйных матэрыялаў і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значна пашырыць кола нацыянальных выданняў па бібліятэчнай справе і запоўніць істотны прабел у вучэбных і метадычных матэрыялах беларусазнаўчай тэматыкі, падрыхтаваных для спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, мае на мэце ўдзел выкладчыкаў і аспірантаў кафедры ў праекце «Практыкам бібліятэчнай справы», які рэалізуе выдавецтва «Новое знание». У адпаведнасці з гэтым праектам два навукова-практычныя дапаможнікі – «Прававое забеспячэнне дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь» (аўтар – выкладчык Ю.М. Галкоўская) і «Фарміраванне кадравых рэсурсаў бібліятэк у новым інфармацыйным асяроддзі» (аўтар – аспірантка І.Б. Стралкова) – знаходзяцца ў друку; 5 дапаможнікаў рыхтуюцца да выдання. Сярод апошніх: «Падрыхтоўка бібліягра-фічнай прадукцыі бібліятэкамі» (дацэнт С.В. Зыгмантовіч), «Менеджмент школьнай бібліятэкі» (прафесар Л.А. Дзямешка), «Бібліятэчны фандрэйзінг» (старшы выкладчык Ю.А. Перавсрзева), «Бібліятэчныя зносіны» (дацэнт Н.У. Клімянкова), «Бібліятэчная сацыяномія» (дацэнт Н.Я. Пятушка), «Бібліятэка і экалогія: пытанні выхавання падлеткаў» (аспірантка В.А. Какшынская).

Гэтыя прыклады яскрава сведчаць не толькі аб ролі выкладчыкаў кафедры ў забеспячэнні вучэбнага працэсу, але і аб іх укладзе ў развіццё айчыннага бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, аб інтэграцыйных працэсах у навуковай, вучэбнай і практычнай дзейнасці.

Кафедра і на новым этапе развіцця працягвае распрацоўку комплексных навукова-даследчых тэм. У 2006 г. паспяхова завершана міжкафедральная тэма «Фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Рэспублікі Беларусь і іх кадравага патэнцыялу: гісторыя і сучаснасць» (2001–2005 гг.), па выніках якой у БелІСА задэпанавана калектыўная манаграфія. Сярод даследчых тэм – прадастаўленне інфармацыйных рэсурсаў карыстальнікам бібліятэк, падрыхтоўка кадраў, фарміраванне сістэмы бесперапыннай адукацыі бібліятэчных кадраў; вывучэнне бібліятэчнай прафесіі, сацыяльнай ролі бібліятэкара ў грамадстве; псіхолага-педагагічныя аспекты ўзаемадзеяння бібліятэкара з чытачом; інфармацыйныя рэсурсы для дзяцей у бібліятэках Беларусі і іх кадравы патэнцыял.

У сакавіку 2006 г. на Савеце універсітэта зацверджана чарговая кафедральная тэма «Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці бібліятэк Беларусі і іх кадравае забеспячэнне». У складзе выканаўцаў тэмы – члены кафедры, аспіранты, магістранты, суіскальнікі, студэнты. Апрабацыя вынікаў работы адбываецца шляхам публікацыі навуковых і навукова-метадычных артыкулаў, удзелу ў міжнародных, рэспубліканскіх і іншых навуковых і навукова-метадычных канферэнцыях. Толькі за два гады працы над тэмай у айчынным і замежным друку апублікавана 57 артыкулаў. Члены кафедры прынялі ўдзел у 20 навуковых і навукова-метадычных канферэнцыях, семінарах, круглых сталах (70 дакладаў).

На даны момант у планах кафедры комплексная распрацоўка пытанняў бібліятэчнай педагогікі, фарміраванне навуковай школы ў межах гэтага напрамку, падрыхтоўка вучэбных, практычных выданняў як для студэнтаў, так і для бібліятэчных спецыялістаў краіны.

Уклад у развіццё галіновай навукі кафедра ўносіць і шляхам падрыхтоўкі навуковых кадраў – магістрантаў і аспірантаў. З 2003 г. падрыхтавана 14 магістраў, у аспірантуры навучаюцца 5 аспірантаў і 1 суіскальнік. Тэматыка навуковых даследаванняў магістрантаў і аспірантаў звязана з актуальнымі праблемамі: фарміраваннем кадравага патэнцыялу бібліятэк ВНУ краіны (аспірантка І.Б. Стралкова), адаптацыяй маладых спецыялістаў да работы ў бібліятэках (суіскальнік І.В. Юрык), фарміраваннем камунікатыўнай кампетэнтнасці бібліятэкараў (аспірантка Л.І. Манукян), экалагічным выхаваннем чытачоў-падлеткаў (аспірантка В.А. Какшынская), падрыхтоўкай і выкарыстаннем біябібліяграфічнай інфармацыі (аспірантка А.Ю. Казленка), работай бібліятэк па развіцці чытацкай дзейнасці падлеткаў (аспірантка І. Марозава), работай ПЦПІ па фарміраванні прававой культуры насельніцтва (магістрантка І. Чупракова) і інш.

Шмат увагі надаецца фарміраванню навыкаў навуковай работы ў студэнтаў: навуковай працай ахоплена больш за 130 студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання, штогод студэнты прадстаўляюць каля 30 дакладаў на студэнцкія навуковыя канферэнцыі універсітэта і іншых навучальных устаноў краіны. Аб эфектыўнасці гэтай работы сведчаць вынікі штогадовага Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў, на які за апошнія 5 гадоў было прадстаўлена 50 работ, з іх 15 (30%) атрымалі дыплом I катэгорыі, астатнія – дыпломы II і III катэгорый.

Выкладчыкі кафедры актыўна супрацоўнічаюць з бібліятэкамі розных тыпаў. Супрацоўніцтва заснавана на ўзаемнай зацікаўленасці ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў бібліятэчнай справы, развіцці айчыннай навукі. Супрацоўніцтва распаўсюджваецца як на вучэбны працэс, так і на павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў, удзел у рабоце грамадскіх прафесійных аб'яднанняў, рэцэнзаванне работ, падрыхтаваных супрацоўнікамі бібліятэк, і інш.

Практыка-арыентаваны характар падрыхтоўкі будучых спецыялістаў бібліятэчнай справы рэалізуецца шляхам правядзення заняткаў на базе вядучых бібліятэк, праходжання студэнтамі вытворчай і пераддыпломнай практыкі ў бібліятэках, выканання курсавых, дыпломных работ, а таксама падрыхтоўкі рэкламных матэрыялаў, бібліятэчных праектаў па заказах бібліятэк. Вопыт і вынікі такой работы знаходзяць адлюстраванне ў спецыяльным галіновым друку [9]. Больш мэтанакіраваны і сістэматычны характар такія сувязі атрымліваюць у межах вучэбна-навукова-вытворчых комплексаў, якія ствараюцца на факультэце сумесна кафедрамі і вядучымі бібліятэкамі. Такая работа на падставе распрацаванага і зацверджанага на факультэце «Палажэння аб вучэбна-навукова-вытворчым комплексе» актыўна вядзецца з бібліятэкай БДУ культуры і мастацтваў; у перспектыве – заключэнне дамовы з Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкай імя М. Астроўскага. Рэалізацыя гэтых праектаў стасуецца з палажэннямі Дзяржаўнай праграмы развіцця вышэйшай адукацыі на 2008–2012 гг. і на перспектыву да 2015 г.

Пастаянны ўдзел у правядзенні заняткаў на курсах павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў вузаўскіх бібліятэк, школьных бібліятэкараў і метадыстаў, спецыялістаў бібліятэк АПК прымаюць прадстаўнікі кафедры С.В. Зыгмантовіч, Л.А. Дзямешка, В.М. Бігеза, Н.У. Клімянкова, Н.Я. Петушка і інш.

Цікавая і карысная работа праводзіцца дацэнтам кафедры У.А. Акулічам (старшыня камітэта па інфармацыйнай культуры Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі) у выглядзе конкурсаў, прысвечаных рабоце бібліятэк краіны па фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў [10]. У 2007 г. у конкурсе актыўны ўдзел прыняла 151 бібліятэка і 37 студэнтаў ФІДК і ФЗН. 4 студэнты сталі пераможцамі. Па выніках конкурсу на кафедры сфарміравана база даных мультымедыйных прадуктаў «Фарміраванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйнай культуры школьнікаў», якую актыўна выкарыстоўваюць бібліятэкары ўсёй рэспублікі. З мэтай павышэння прафесійных кампетэнцый бібліятэчных спецыялістаў па фарміраванні інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк штогод праводзіцца «Школа інфармацыйнай культуры» [11].

Прыведзеныя прыклады сведчаць аб шчыльным спалучэнні тэорыі і практыкі ў вучэбным працэсе і навукова-даследчай рабоце. Можна падкрэсліць і вялікі выхаваўчы патэнцыял для студэнцкай моладзі, звязаны з удзелам у канкрэтных праграмах, праектах, падрыхтоўцы і выкананні заданняў па заяўках бібліятэк і іх ацэнкай з боку прадстаўнікоў бібліятэк. Гэтыя кірункі дзейнасці з'яўляюцца прыярытэтнымі для развіцця кафедры.

Далейшая дзейнасць кафедры па падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў звязана з неабходнасцю ўдумлівай і творчай рэалізацыі палажэнняў Дзяржаўнай праграмы развіцця вышэйшай адукацыі на 2008–2012 гг. і на перспектыву да 2015 г. Падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў з 2008 г. будзе ажыццяўляцца на падставе новых адукацыйных стандартаў, у адпаведнасці з якімі першая ступень вышэйшай адукацыі прадугледжвае чатырохгадовы тэрмін навучання, рэалізацыю ў працэсе навучання кампетэнтнаснага падыходу, накіраванага на фарміраванне ў будучых спецыялістаў прафесійных (вытворча-тэхнічных, сацыяльна-культурных, навукова-метадычных, навукова-даследчых, арганізацыйна-кіраўніцкіх, педагагічных, інавацыйных), адукацыйных, сацыяльна-асабовых кампетэнцый. Кампетэнтнасны падыход азначае паступовую пераарыентацыю дамініруючай адукацыйнай парадыгмы з пераважнай трансляцыі ведаў, фарміравання навыкаў на стварэнне ўмоў для авалодання комплексам кампетэнцый, развіцця творчага патэнцыялу, здольнасцей выпускніка да выжывання і ўстойлівай жыццядзейнасці ва ўмовах сацыяльна-палітычнай і рынкава-эканамічнай шматфактарнасці, інфармацыйнай і камунікатыўнай насычанасці сучаснага грамадства. Сярод складаных пытанняў, якія патрэбна вырашыць прафесарска-выкладчыцкаму складу кафедры – абнаўленне зместу і структуры вучэбных праграм; распрацоўка новага пакалення вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу; укараненне інавацыйных камп'ютэрных і сацыяльных тэхналогій навучання, накіраваных на павышэнне пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Магчыма, гэта будзе ўжо наступны этап развіцця кафедры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЛІТАРАТУРА

1. **Симановский, И.Б.** Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы к 40-летию Великой Октябрьской социалистической революции / И.Б. Симановский // 40 лет библиотечного строительства в СССР: доклады научной конференции, 23–26 декабря 1957 г. Москва, 1958. С. 191–286.

2. **Минченя, Т.Н.** Белоруссия: Национальная библиотека / Т.Н. Минченя // Библиотечная энциклопедия. Москва, 2007. С. 82–84.

3. **Акулич, В.А.** Белоруссия: библиотечное дело / В.А. Акулич, Н.В. Клименкова // Библиотечная энциклопедия. Москва, 2007. С. 80–82.

4. **Покало, М.И.** История библиотечного дела в БССР / М.И. Покало. Мінск: Вышэйшая школа, 1986. 130 с.

5. **Колоско, Н.М.** Библиотечное строительство в Белоруссии (1917–1925 гг.): автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата педагогических наук: 05.25.03 / Н.М. Колоско; Московский государственный институт культуры. Москва, 1973. 34 с.

6. **Емец, И.П.** Роль библиотек Белорусской ССР в социалистическом строительстве (1926–1937 гг.): автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 07.00.02 / И.П. Емец; Минский государственный педагогический институт им. А.М. Горького. Минск., 1981. 24 с.

7. **Латотина, Т.Т.** Деятельность Компартии Белоруссии по развитию библиотечного дела в республике (1959–1965 гг.): автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 07.00.01 / Т.Т. Латотина; Белорусский государственный университет им. В.И. Ленина. Минск, 1977. 26 с.

8. **Дукель, В.А.** Педагогические основы влияния открытого доступа к фондам библиотек на формирование читательских интересов (на примере библиотек Белоруссии): автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата педагогических наук: 13.00.01 / В.А. Дукель; Минский государственный педагогический институт им. А.М. Горького. Минск, 1979. 20 с.

9. **Дзямешка, Л.А.** Бібліятэка – універсітэт: супрацоўніцтва ў навучальным працэсе / Л.А. Дзямешка, С.А. Паўлава // Бібліятэчны свет. 2007. № 1. С. 20–21.

10. **Акулич, В.А.** «...На тарелочке да с голубой каёмочкой» / В.А. Акулич // Бібліятэчны свет. 2007. № 1. С. 13–15.

11. **Акулич, В.А.** ШИК – это школа информационной культуры / В.А. Акулич [и др.] // Бібліятэка прапануе. 2007. № 4. С. 26–28.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ